# «Прыйдзе шчасця пара залатая...»

Скідзельшчына – самабытны куток Беларусі з багатай і цікавай гісторыяй. Тут нарадзілася шмат таленавітых людзей. Сярод іх паэт-рэвалюцыянер былой Заходняй Беларусі Міхась Васілёк, чые 100 гадоў з дня нараджэння адзначаецца сёлета.

А быў ён родам нездалёк –
Там Котра хвалю сцеле.
І жыў на свеце Васілёк,
Або – Міхась Касцевіч...

Для свайго літаратурнага імя ён узяў назву звычайнай кветкі нашага поля, якая даўно стала сімвалам красы Беларусі. Васілёк заўсёды рос на сялянскай ніве побач з коласам. На добрай, народнай ніве выспяваў паэтычны талент М. Васілька. Шмат горкага давялося зведаць яму на сваёй жыццёвай дарозе.

Нарадзіўся М. Васілёк (Міхаіл Восіпавіч Касцевіч) 14 лістапада 1905 года ў вёсцы Баброўня Гродзенскага раёна ў сям'і лесніка. Звычайнае басаногае дзяцінства, у час імперыялістычнай вайны выехаў з бацькамі ў бежанства, у Расію. Там перажыты рэвалюцыя, грамадзянская вайна, там скончыў сярэднюю школу, там памерла яго маці. У 1922 годзе сям'я вярнулася ў мілую сэрцу Баброўню. Але тут ужо гаспадарыў белапольскі рэжым. Тут чакалі малазямелле, беднасць.

Міхась Васілёк далучаецца да нацыянальна-вызваленчага руху, становіцца актывістам Грамады, ТБШ, прымае дзейсны ўдзел у культурна-асветнай рабоце на вёсцы.

Свае творы пачаў друкаваць у 1926 годзе. Рэдка які нумар часопіса «Маланка» выходзіў без вершаў М. Васілька.

У 1929 годзе ў Вільні выйшаў першы зборнік паэзіі «Шум баравы», канфіскаваны паліцыяй. Яго імя ведаў у Заходняй Беларусі кожны дарослы чалавек. Яго вершы завучваліся напамяць, чыталіся на рэвалюцыйных сходках і мітынгах, шырока друкаваліся ў віленскіх газетах і часопісах. М. Васілёк стаў адным з пачынальнікаў літаратуры Заходняй Беларусі, самым папулярным паэтам.

Радкамі сваіх твораў ён перадаваў думкі і пачуцці заходнебеларускіх працаўнікоў, цярпеўшых жорсткі нацыянальна-духоўны прыгнёт ва ўмовах санацыйнага рэжыму, апяваў свабоду, з'едліва высмейваў паноў. М. Васілёк змагаўся за свабоду і шчасце свайго народа. Самае запаветнае жаданне паэта –

Каб красавала
свабодная ніва,
Каб дачакаўся
ўраджайнага жніва
Край падняволены мой.

Яго праследавала паліцыя, улады, не раз арыштоўвалі, садзілі ў турмы.

У 1937 годзе выйшаў у Вільні зборнік яго вершаў «З сялянскіх ніў». У 1939 годзе М. Васілька мабілізуюць у польскае войска. Неўзабаве ён трапляе ў гітлераўскі палон, дзе сустрэўся з Я. Брылём. Я. Брыль успамінае, што з асаблівай жорсткасцю і лютасцю фашысты адносіліся да польскіх салдат, і нават М. Васільку, прывычнаму да гора і слёз, жыццё ў палоне здавалася пеклам.

Летам 1941 года ўдалося ўцячы з палону і дабрацца да родных мясцін. Дома ён уключаецца ў антыфашысцкую барацьбу, становіцца старшынёй Скідзельскага падпольнага антыфашысцкага камітэта, які аб'ядноўвае 19 груп. У гады вайны яго вершы змяшчаюцца ў партызанскім друку пад псеўданімам Язэп Гром.

У 1944—1946 гадах М. Васілёк працуе ў скідзельскай раённай газеце «Чырвоны сцяг», з 1949 – у «Гродзенскай праўдзе».

У пасляваенны час выйшлі яго кнігі «Выбраныя вершы» (1950), «Выбраныя творы» (1955), «Зоры над Нёманам» (1963), «Вершы» (1973).

Памёр М. Васілёк у верасні 1960 года.

У знак памяці паэта адна з вуліц горада Скідзеля носіць імя М. Васілька. А 17 лістапада 1992 года ў нашым вучылішчы быў адчынены літаратурна-краязнаўчы музей імя паэта. Экспазіцыя музея складаецца з 8 раздзелаў. Найбольш значнае месца ў ім адведзена жыццёваму і творчаму шляху знанага паэта-земляка. З музейных экспанатаў шмат можна даведацца пра паэтаў-рэвалюцыянераў былой Заходняй Беларусі, творцаў краю. На сённяшні дзень музей налічвае звыш тысячы экспанатаў, больш 80 з іх узяты на дзяржаўны ўлік – яны прадстаўляюць пэўную гістарычную каштоўнасць. У музеі знаходзяцца асабістыя рэчы паэта: касцюм, крэсла, радыё, дыван, чатыры зборнікі вершаў, копіі архіўных дакументаў, матэрыялы часоў Вялікай Айчыннай вайны, нумары часопіса «Маланка» з вершамі М. Васілька. У музеі захоўваюцца ўспаміны і творы пра яго Максіма Танка, Вольгі Іпатавай, Янкі Брыля, Ніны Тарас, Пятра Прыходзькі, Анатоля Іверса, Юркі Голуба, Данўты Бічэль. Ёсць ўспаміны сваякоў, сяброў: С. Бандарэнкі, Ф. Самойла, А. Цыхуна.

Пэўнае месца займае і этнаграфічны куток. Ён аформлены ў выглядзе беларускай сялянскай хаты. Тут ёсць старадаўнія прылады працы, прадметы хатняга ўжытку, посуд, саматканае адзенне і г.д. Усё гэта сабрана і аформлена сіламі навучэнцаў прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча № 199.

За час існавання музея ў ім пабывала больш 16 тысяч наведвальнікаў, а ён стаў цэнтрам выхаваўчай работы ў вучылішчы. Тут праходзяць сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі, літаратурныя гасцёўні, конкурсы, завочныя падарожжы, вечары, віктарыны, праводзяцца ўрокі па беларускай літаратуры... Вельмі цікава прайшлі мерапрыемствы – конкурс «Міс беларусачка», літаратурна-музычная кампазіцыя «У сузор'і талентаў», «Матулін ручнік». Удалося сабраць калекцыю з 40 саматканых вышываных ручнікоў.

На базе музея праводзяцца сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, заслужанымі жыхарамі Скідзельшчыны. Іх расказы робяць жыццядайны ўплыў на фарміраванне патрыятычных і нацыянальных пачуццяў, усталяванне павагі да людзей працы, жадання паўней і глыбей спасцігаць жыццёвую мудрасць сваіх продкаў.

**А. САЛЕЙ,**
**намеснік дырэктара ПТВ № 199 па вучэбнай рабоце.**

**НА ЗДЫМКУ: у музеі М. Васілька ў Скідзельскім ПТВ № 199.**

**Фота А. ПЕРАХОДА.**